# Ад першадрукара Скарыны да сучаснай беларускай кнігі
(да 505-годдзя гісторыі беларускага кнігадрукавання)

# «Асветнікі зямлі беларускай»

Семянюк Наталля Чаславаўна

Загадчык Жалудоцкай гарпасялковай бібліятэкі

Важную ролю ў культурным жыцці цывілізаваных краін і народаў адыгрывалі асветнікі – самаадданыя людзі, якія неслі сваім землякам, суродзічам святло ведаў.



Гэтыя асобы пісалі, перакладалі і выдавалі кнігі, стваралі вершы, малітвы і пропаведзі, засноўвалі храмы, манастыры, школы.



# Кірыла Тураўскі



Выдатны красамоўца, царкоўна - палітычны дзеяч, мысліцель і пісьменнік.

Нарадзіўся ў 1130 годзе

На старонках сваіх твораў ён прапанаваў агульныя прынцыпы справядлівага ўладкавання грамадства, акрэсліў мадэль сацыяльных паводзін чалавека.





Высокі ўзровень адукацыі, праведнае жыццё зрабілі вядомым імя маладога манаха далёка за межамі Тураўскага княства. Аднак душа патрабавала большага, таму Кірыла Тураўскі і здзейсніў духоўны подзвіг стоўпніцтва. На некаторы час ён зачыніўся ў вежы на рацэ Прыпяць, каб цалкам аддацца роздуму і малітвам. Дарэчы, там ён і ствараў значную частку сваіх аповесцяў, пасланняў і павучэнняў.

# Помнікі асветніку ўстаноўлены ў Мінску, Тураве, Гомелі







# Еўфрасіння Полацкая



Бясспрэчна, што самай выдатнай і знакамітай асветніцай на беларускай зямлі за ўсю яе шмат-вяковую гісторыю была славутая палачанка  Еўфрасіння.

Нарадзілася ў 1120 годзе

Князёўна, ігумення, настаўніца, выдатная асветніца, першая беларуская мецэнатка, святая, якая лічыцца апякункаю нашай зямлі.



Еўфрасіння ініцыявала будаўніцтва жаночага Спаскага манастыра. З імем Еўфрасінні звязваецца набыццё Полацкім Сафійскім саборам абраза Багародзіцы Эфескай. У 1161 годзе яна замовіла мясцоваму майстру Лазару Богшу выраб напрастольнага крыжа з рэліквіямі, які пазней стаў вядомы як Крыж Еўфрасінні Полацкай.







# Помнік славутай суайчынніцы ў Полацку



# Францыск Скарына



Беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, заснавальнік беларускага і ўсходнеславянскага кнігавыдання, асветнік-гуманіст, мысліцель, пісьменнік, перакладчык, вучоны-медык.

Нарадзіўся ў 1490 годзе

Францыск Скарына быў наватарам у кнігавыдавецкай справе: увёў тытульны ліст і аркушавую нумарацыю старонак замест сшыткавай.


а

Книга светого Иова починаетсѧ еже словет Иовъ. З уполне выложена доктором Францискомъ Скориною с Полоцка

Богу в Троици единому к чти и к славе:
Матери его Пречистой Марии к похвале:
Всем Небесным силам, и Светым его к веселию:
Людем посполитым к доброму научению:

3

Шрыфтам , які распрацаваў Скарына, карысталіся яшчэ стагоддзе.



Ён зрабіў ілюстрацыі да асобных эпізодаў Бібліі, намаляваў аўтапартрэт, упрыгожыў тэкст застаўкамі і канцоўкамі.




Тытульны аркуш Біблії Францыска Скарыны



У гонар кнігавыдаўца зацверджаны вышэйшыя ўзнагароды краіны – медаль і ордэн Францыска Скарыны.






# Помнікі першадрукару  ў  Мінску і ў Полацку





# Гісторыя ўзнікнення кнігі

- Лічыцца, што першыя кнігі з'явіліся 5000 гадоў таму ў Старажытнай Месапатаміі. Матэрыялам для іх паслужыла гліна, на якой пісалі завостранымі палачкамі. Пасля таго, як выраб абпальваўся, унесці змены ў тэкст было ўжо немагчыма. Адна кніга магла ўключаць дзесяткі, а часам і сотні гліняных таблічак. Вокладкай для яе служыла драўляная скрыня. Важыла такая кніга даволі шмат, таму карыстацца ёй было не надта зручна.

# Гліняная таблічка



# Кнігі з папіруса



Старажытныя егіпцяне рабілі кнігі з папіруса. Але з-за крохкасці папіруса нельга было згінаць, таму яго скручвалі ў трубачку – світак.

# Кнігі з бяросты



- У старажытнасці людзі пісалі на бяросце – верхні слой кары бярозы. Для запісу выкарыстоўвалі вострыя жалезныя ці касцяныя стрыжні. Імі выдзіралі літары і малюнкі.

# Кнігі з папіруса і пергамента



- Папярэднікамі паперы лічацца папірус і пергамент.Але папірус рос не ўсюды, а світкі дрэнна захоўваліся і людзі знайшлі новы матэрыял – пергамент. Гэта тонкая, спецыяльна выробленая шкура авечак, коз , цялят.

# Воскавыя кнігі




- Старажытныя грэкі прыдумалі воскавыя кнігі. Гэта было некалькі дошак з квадратнай выемкай, якая залівалася воскам. Пісалі на такіх «старонках» завостранымі палачкамі.

# Кнігі з паперы




- З’яўленне паперы дазволіла значна паменшыць кошт кніг. Спачатку паперу ўручную выраблялі з шоўку, пасля – з ануч, пазней з перамолатага дрэва – цэлюлозы.

# Электронныя кнігі




- Цяпер набіраюць папулярнасць электронныя кнігі, для іх вытворчасці няма неабходнасці выкарыстоўваць лес. А самае галоўнае , у тваёй кішэні можа змясціцца цэлая бібліятэка!

# Дзякуй за ўвагу.

# Спіс выкарыстанай літаратуры:


- Людзі – галоўны скарб зямлі беларускай .-Мінск: Беларусь,2021.- 128с.:іл.- (Вялікая энцыклапедыя маленькага прафесара).
- Марціновіч, А. Златавуст з Турава: нарыс: для малодшага школьнага ўзросту/ Мастак А.Ю. Кашаноўскі. – Мінск: Юнацтва, 2000.- 127с.:іл.
- Марціновіч, А. Святая Еўфрасіння: нарыс: для малодшага школьнага ўзросту/ Мастак В.П. – Мінск: Юнацтва, 1999- 62с.:іл.
- Суша, А.А. Францыск Скарына. У 3 ч. Ч. 1. Чалавек- энцыклапедыя: для сярэд. і ст. шк. ўзросту / Алесь Суша. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П . Броўкі, 2016.- 120с.:іл.- ( Беларуская дзіцячая энцыклапедыя)
- Дубянецкі, Э.С. Ефрасіння Полацкая. Кірыла Тураўскі. Францыск Скарына : для сярэд. і ст. шк. ўзросту /Э.С. Дубянецкі. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П . Броўкі, 2016.- 72с.:іл.- (Ганаруся табой, Беларусь).